# Літаратура в рабочей спецовке



*Да 75-годдзя з дня нараджэння*

# ПІСЬМЕННІК, ДРАМАТУРГ, ПУБЛІЦЫСТ

***1 студзеня 2023 года Васілю Ткачову – вядомаму гомельскаму празаіку, драматургу і публіцысту, споўнілася б 75 гадоў. Цэлых тры гады свайго жыцця – з 1980-га па 1983-ці – ён працаваў на "Гомсельмашы", быў супрацоўнікам шматтыражнай газеты "Сельмашавец", расказваў пра жыццё прадпрыемства, пісаў нарысы аб яго працаўніках. У лютым бягучага года ён пайшоў ад нас, але да скону сваіх дзён заставаўся з сельмашаўцамі, бо жыў у мікрараёне камбайнабудаўнікоў, кожны дзень сустракаўся з імі і шмат каго зрабіў прататыпамі сваіх герояў.***

## ТВОРЧЫЯ ЗДАБЫТКІ

Васіль Юр'евіч Ткачоў – лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі па драматургіі за кнігу п'ес "Характары" (2017), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі за раман "Дом камуны". Лаўрэат літаратурнай прэміі імя М. Доўнар-Запольскага і расійскай прэміі Баяна, прэміі імя Васіля Віткі, якая прысуджаецца часопісам "Вясёлка", Гомельскіх абласных літаратурных прэмій імя Кірылы Тураўскага і імя Аляксандра Капусціна, прэміі Саюза беларускіх журналістаў і міжнароднай прэміі "Дружба" за лепшы публіцыстычны твор (нарыс "Сонцам хлеб на стале"). Яго п'еса "Стары і дарога" адзначана першай прэміяй на рэспубліканскім конкурсе ў 1985 годзе. Ён узнагароджаны медалём Саюза пісьменнікаў Беларусі "За вялікі ўклад у літаратуру" (2011) і Ганаровай граматай Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (2007), медалём Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі "Кірыла Тураўскі. Асветнік. За ўклад у літаратуру". Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі (2014), лаўрэат прэміі Рагачоўскага райвыканкама "Залаты рог" (2014), Ганаровы грамадзянін Рагачоўскага раёна.

Першае сваё апавяданне Ткачоў надрукаваў у 1966 годзе ў часопісе "Вясёлка". У больш познія часы выдаў звыш двух дзесяткаў кніг для дзяцей і дарослых, кніг публіцыстыкі, гумару і зборнікаў п'ес. Ён – укладальнік і рэдактар шэрагу калектыўных літаратурнамастацкіх зборнікаў, быў вядучым аўтарскай перадачы на Гомельскім тэлебачанні "На прызбе з Васілём" (2001-2003).

Звыш пяцідзесяці драматычных твораў і п'ес-казак для дзяцей, якія выйшлі з-пад пяра Васіля Ткачова, вандруюць сёння па тэатрах краін СНД, ставяцца як самадзейнымі, так і прафесійнымі тэатральнымі калектывамі. Яго творы пастаянна друкаваліся на старонках рэспубліканскай і мясцовай прэсы, асобныя апавесці і апавяданні перакладаліся на рускую, украінскую, польскую, туркменскую, удмурцкую і марыйскую мовы, з'явіліся ў падручніках для вучняў малодшых класаў беларускіх школ.

Але ж, з чаго ўсё пачыналася? Аб гэтым ён не адзін раз расказваў, звяртаючыся да таго або іншага эпізоду са свайго жыцця. Яму і слова.

## ЖЫЦЦЁ НА МЯЖЫ

– Нарадзіўся я 1 студзеня 1948 года ў вёсцы Гута Рагачоўскага раёна. Гэта каля Журавіч. Бацькі – вясковыя настаўнікі, Вольга Якаўлеўна Тарасава і Юрый Трафімавіч Ткачоў. Прозвішчы розныя таму, што маці, як скончыла педінстытут ды атрымала дыплом, дык перапісваць ужо нічога не пажадала. Працавалі ўвесь час побач, у Іскані Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Як мы казалі тады – "за бугром". На мяжы Гомельшчыны і Магілёўшчыны. У той вёсцы і пахаваныя. Калі заканчваў старэйшыя класы, жыў у дзеда з бабкай у Гуце, хадзіў за два кіламетры ў Ільічоўскую школу.

Як вучыўся? А як я мог вучыцца, калі быў сакратаром камсамольскай арганізацыі? Мяне, думаю, у сакратары выбралі больш за тое, што я ў газеты пісаў. Але ж марку трымаць даводзілася.

* * *

– Усе мае продкі – сяляне. Але ад дзеда Якава пайшлі ўжо настаўнікі. Праўда, дзядзька Мішка пасля заканчэння 10 класаў вучыцца больш не пажадаў. Ды быў разумным. Нават намеснікам дырэктара фабрыкі працаваў. Шустры – не дай Бог, таму і мянушку атрымаў – Козыр. Калі сына жаніў, дык адзін вясковы паэт на хаду частушку зляпіў:

*І не будзем мы шумець,*
*І не будзем біцца,*
*А то Козыр нам не дасць*
*Зранку пахмяліцца.*

Во, талент у чалавека!

Цяпер, што тычыцца майго дзеда... Калі ў Магілёве ставілі п'есу "Сівы бусел", я запрасіў на прэм'еру цётку Ніну. Яна ў Магілёве жыла. А ў галоўнай ролі – заслужаны артыст рэспублікі Рыгор Белацаркоўскі. Выліты дзед Якаў: такі ж высокі, паджары. Цётка глядзіць і плача: "Роўна бацька наш".

Бываюць жа супадзенні.

* * *

– Што найболь запомнілася з дзяцінства?.. Вельмі багата снегу на вуліцах, малеча з больш дарослымі пацанамі капае тунэлі. Зайцы ў капканах. Абгрызеныя імі яблыні. Вечарамі шум і гам на гары: хто на чым едзе з яе ўніз і, здаецца, тут уся вёска. Каталіся ў асноўным на драцянках. Канькі – рэдкасць. Пазней працавалі на школьнай трусагадоўчай ферме. Падарунак – кашуля. Я і цяпер яе памятаю. Прыгожая. Уручаў сам дырэктар школы Іван Іванавіч Хамічкоў. Бацька купіў фотаапарат, веласіпед "Арляня". Нарадзіўся брат Міша. Збіраў грошы, каб выкупіць яго ў радзільным доме. К таму часу, калі зявілася на свет сястра Таня, паразумнеў. Потым было нараджэнне двайнюкоў Валодзі і Сашы.

Эх, дзяцінства, дзяцінства! Вярнуць бы цябе хоць на дзянёчак! Апрануць тыя лахманы, з'есці праснак з мёрзлай калгаснай бульбы, пакатацца на крыгах у лёдаход...

* * *

– Самы недарэчны ўчынак з дзяцінства, за які мне і сёння сорамна, – гэта калі на салдацкай картцы Пятра – брата маёй бабкі Пелагеі – я выкалаў вочы. Дурань быў. Узяў іголку і пракалоў. Якраз, дзе зрэнкі. А фотакартка адна была. Гэта запомніў на ўсё жыццё. Ну, вядома, і папала добра. Ад маці, ад бабкі. Дзед не біў ніколі. А бабка ручніком магла даць пры выпадку.

* * *

– Памятаю, заўсёды выносіў сябрам з дома лусты хлеба. У ваду макну, цукрам пасыплю – і нясу. А мяне ўжо чакаюць. Гэта цяпер разумею, што ў сяброў не было чаго есці. А ў нас сям'я працавітая, калі бацькі настаўнічалі, нават грошы нейкія вадзіліся. Вось я і падкармліваў. А бабка цікавала: "Ах ты, нягоднік!"

* * *

– Быў адзін выпадак... Я яго выкарыстаў у аповесці "Скачы ад печы, жэўжык". Бабка Пелагея неяк пайшла ў краму і купіла цэлую хустку запалак. Я адзін пачак украў, занёс бабулі адной. Мы, дзеці, збіраліся ў яе, грэліся каля печы. А запалак не было. Вось я і занёс. Бабка Пелагея пералічыла: "Дзе падзеў?" Вымушаны быў пайсці, забраць.

* * *

– Колькі сябе памятаю, увесь час хацеў стаць пісьменнікам. Вось хачу – і ўсё. О, гэта для мяне былі недасягальныя людзі! Калі з Міхасём Пятровічам Даніленкам (*былы гомельскі пісьменнік і журналіст* – **аўт.**) пачаў перапісвацца і прыехаў першы раз у Гомель, каго ні сустрэну, добра апранутага, адразу думаю: "Можа, гэта ён?" А зайшоў у кабінет – звычайны чалавек.

Мне, безумоўна, пашчасціла, я сустракаўся з многімі пісьменнікамі. Сябраваў з Іванам Пятровічам Шамякіным. Удзельнічаў у 1992 годзе ў рабоце IX з'езда Саюза пісьменнікаў СССР. Гэта быў яго апошні з'езд. Жылі ў гасцініцы "Расія". Расула Гамзатава бачыў, Валянціна Распуціна, Віктара Астаф'ева, іншых. Нехта ў зале сядзіць, прамовы слухае, іншыя спускаюцца ўніз у буфет, выпіваюць. Аднаго пісьменніка ахова пад рукі трымала: "Вам хопіць". А ён, як цуцык, п'яны. Дарэчы, вельмі вядомы і таленавіты, але такі ж чалавек, як і ўсе. Таму і прозвішча не называю. Не гэта ў жыцці галоўнае.

* * *

– Мяне і сёння здзіўляе, адкуль на нашым агародзе ў дзяцінстве было столькі патронаў. Цэлыя абоймы выляталі з-пад рыдлёўкі. Мы іх разбіралі, порах адсыпалі, кульку зноў на месца ладкавалі, крыху пораху зверху. Трымалі ў руцэ і падпальвалі. Шух – паляцела. А калі б у твар? А то Валерка Юрчанка ўкраў у бацькі пораху "Дымок". Лёгенькі такі. Мы яго падпалілі, а ён як даў у вочы, аж бровы абсмажыла. Я ў дзяцінстве жвавы быў.

* * *

– Маё першае апавяданне называлася "Мутная вада". Напісаў – чытаю бацькам. Яны смяюцца. І назва "Мутная вада", і апавяданне мутнае. Я там пра партызан хацеў нешта расказаць: па рацэ ішлі, ваду замуцілі. На жаль, яно не захавалася. Першы вопыт, 6-7 клас.

* * *

– Я вучыўся ў 11 класе. У першым нумары "Вясёлкі" за 1966 год надрукавалі маё першае апавяданне "Шчарбаты нож". І вось ідзе па вуліцы паштальёнка, туды-сюды перавальваецца праз гурбы снегу. "Табе, дзед, пенсія", – і дае 12 рублёў. "А вам – ганарар",– і працягвае мне 14 рублёў. "Дык за што табе столькі? – здзівіўся дзед. – За такое маленькае? Дык пішы кожны дзень, багата жыць будзеш".

Але ж для дзяцей цяжка пісаць. Таму пісаў мала. Хаця, калі напішу для дзяцей, такую асаладу атрымліваю. Бо я ж адчуваю – знайшоў, ёсць апавяданне.

* * *

– У школьным узросце я друкаваўся не толькі ў "Вясёлцы". Яшчэ і ў "Вожык" нешта адсылаў. Але дыяпазон быў слабенькі, дарослыя апавяданні не ішлі. Таму лупіў артыкулы ў газеты. Друкаваўся ў "ЛіМе", "Звяздзе", "Чырвонай змене", "Гомельскай праўдзе". Добрыя грошы атрымліваў. Выпісваў газеты. У Гуце, дзе я жыў, не было ні клуба, ні бібліятэкі, а ў мяне ўсе газеты былі. Ды і колькі яны тады каштавалі? І заўсёды даваў грошы бабулі: "Гэта табе на цукар". Быў нават моманты, калі аднакласнікаў запрашаў у школьны буфет. Гарбата там, коржыкі. Усім класам. І – "Я разлічваюся".

Зух, адным словам.

* * *

– Да дзяўчат я неяк позна прызвычаіўся. Не да іх было: дапамагаў па гаспадарцы, вечарамі пісаў. Бегаў, зразумела, на танцулькі пад гармонік. Нават вальс "Дунайскія хвалі" вывучыў. У мяне, увогуле, мара была – навучыцца іграць. Баян сабе купіў. Ды падарыў потым пляменніцы, яна ў вучылішчы займалася, нешта мне па тэлефоне наігрывала. А ў мяне не атрымалася. Відаць, усяго не ахопіш.

## СТАНАЎЛЕННЕ

– Пасля заканчэння школы адбыўся выпускны, і я ў той жа дзень паехаў у Івацэвічы працаваць у раённую газету. Рэдактар неяк выступаў па радыё, запрашаў супрацоўнікаў. Я напісаў ліст. Там, у Івацэвічах, упершыню адчуў насталгію па родных мясцінах. Напісаў Міхасю Даніленку: "Дапамажыце вярнуцца на Гомельшчыну". І вось з Новага года пачала выходзіць кармянская "Зара над Сожам". Мікола Дубавец прапанаваў паехаць туды. Згадзіўся. Атрымлівалася добра, маёй газета аказалася. Давалі вялікія "падвалы", іншае, што пісаў. За год ад літаратурнага супрацоўніка да загадчыка аддзела вырас, без вышэйшай адукацыі. І нікога не падседжваў. Само атрымалася.

**(Заканчэнне ў наступным нумары).**

# Литература в рабочей спецовке

Да 75-годдзя з дня нараджэння

## ПІСЬМЕННІК, ДРАМАТУРГ, ПУБЛІЦЫСТ

**1 студзеня 2023 года Васілю Ткачову – вядомаму гомельскаму празаіку, драматургу і публіцысту, споўнілася б 75 гадоў.**



(Заканчэнне. Пачатак у № 95)

### СТАНАЎЛЕННЕ

– У 1967 годзе мяне прызвалі ў армію. Скончыў вучэбку ў Пскоўскай вобласці. Потым было размеркаванне. Нам жа не кажуць, куды вязуць. А вярблюды ходзяць, сонца пячэ. Тады яшчэ Аральскае мора высыхаць не пачало, рыбы – любой, і на кожнай станцыі. Гэта зараз як едзеш – адны шхуны ды баржы ржавеюць, занесеныя пяском. Трапілі на Байканур, на другую пляцоўку, з якой Гагарын у космас паляцеў. Мы рыхтавалі ракету на Месяц, а яна ж – 113 метраў. Я сяржантам з вучэбкі выпусціўся, быў камандзірам хімічнай лабараторыі. Ездзілі, прывозілі па чыгунцы кісларод. А ён дыміцца, тэмпература – пад мінус дзвесце, на палец трапіць – адваліцца. Бралі, рабілі аналізы. Але рабілі пакольці-пастольці. Сапраўднымі аналізамі цывільныя людзі займаліся, спецыялісты высокага класа. Мы – так, для парадку. Потым я трапіў у палітаддзел. Заўважыў мяне Эдзік Габунія – грузін, старшы лейтэнант. Выклікаў, прапанаваў пайсці інструктарам па камсамольскай рабоце. Чаму ж не пайсці? На цэнтральную пляцоўку? Там Дом афіцэраў і свая тэлестудыя. Калі мяне прывялі на размову з начальнікам палітаддзела генерал-маёрам Міхаілам Іванавічам Дружыніным, той адразу спытаў:

– Адкуль?

– З Беларусі.

– Бярыце. Беларусаў паважаю.

Ён, аказваецца, за вызваленне Віцебска, калі быў яшчэ капітанам, Зорку Героя атрымаў, ведаў нашых людзей.

Што я там рабіў? Тэлефанаграмы перадаваў, паперы розныя рыхтаваў. А больш славіў: пісаў артыкулы ў газету. І шмат каго з касманаўтаў бачыў. Яны пасля вяртання з космасу прыляталі на аэрадром за горадам. Калі ехалі па вуліцах, людзі выходзілі вітаць. Яшчэ бачыў Узбекалі Джанібекавіча Джанібекава – першага сакратара ЦК камсамола Казахстана, Яўгена Міхайлавіча Цяжэльнікава – кіраўніка Усесаюзнага ЦК камсамола. Я ім свежыя газеты ў гасцініцу насіў. Адзін раз забыўся – добрую прачуханку атрымаў. Яраслава Галаванава бачыў. Ведаю, як Канстанціна Сіманава на Байканур не пусцілі. Гэта ж сакрэтны аб'ект быў, а ён хацеў па дарозе з Ташкента без допуску заехаць. Адным словам, Байканур – асобная старонка ў маім жыцці.

* * *

– Накіраванне на вучобу мне дала акруговая газета "Фрунзенец". Там беларус Саша Ганчароў загадваў камсамольскім аддзелам. З яго падачы мне і прапанавалі паступіць на факультэт журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча. А я думаю, чаму б не паехаць? Паступлю ці не – адзін Бог ведае. А дамоў заехаць змагу, бацькоў пабачу. Так многія тады рабілі. Толькі ўзяў і паступіў. А потым пачалася вучоба, на чатыры гады, з 1969 па 1973-ці.

* * *

– У вучылішчы ў мяне быў сябар Валерка Глездзянёў, удмурт. Ён пазней у Афганістане загінуў. На зімовыя канікулы мы да маіх бацькоў паехалі, на летнія – да яго, пад Іжэўск. Прыязджаем, а ў Валеркавых бацькоў кватаруюць дзве дзяўчыны. Іх з гандлю на дапамогу калгасу кінулі. Адна з іх, Валянціна, пазней маёй жонкай стала. Пазнаёміліся, хадзілі, размаўлялі, я прапанаваў: "Выходзь за мяне замуж". Згадзілася. Прыгажуня. А я ж худы ды вушаты. Пазней у мяне пыталіся: "Што яна ў табе знайшла?" Ды вось знайшла ж нешта.

Прыехала да мяне ва Львоў, вяселле ў вёсцы згулялі. Гэта было пасля другога курса. Потым пайшла працаваць на радыёзавод, а як зацяжарыла – адправіў яе да бацькоў у Іскань, у бібліятэку ўладкаваў. Прыходзіць да яе неяк вясковы баламут Шура, просіць сваёй жонцы больш не выдаваць кніжак: "Начытаецца, а потым як пачне "граматна ругаць", дык не ведаю, што казаць". І смех, і грэх.

* * *

– Пасля заканчэння вучылішча я сем гадоў адслужыў у Ашхабадзе. У дывізіённай газеце "За Радзіму". Штат – тры афіцэры: лейтэнант Ткачоў і два маёры. Яны мяне з'елі, баяліся, што займу іх пасады. Асабліва адзін гадам быў. Накіравалі за 200 кіламетраў у медсанбат начальнікам клуба. А я не паехаў. Жонка ў пракуратуры працавала, я яе ўладкаваў туды машыністкай, дык пракурор падтрымаў: "Не хочаш – не едзь. У крыўду не дам". Прыехаў падпалкоўнік з палітаддзела ўгаворваць, а я заўпарціўся. Так і кінуў службу. Сябры з радыё дапамаглі ў "Туркменгандальрэкламу" ўладкавацца, жонку туды забраў загадчыкам склада гатовай прадукцыі. Мапед сабе купіў. Перад штабам еду – пі-піп. Добра жылі, я нават у Кіеў на курсы па рэкламе пры гандлёвым інстытуце з'ездзіў. Але захацелася на Радзіму.

### ПОКЛІЧ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

– У 1980 годзе з Сярэдняй Азіі я прыехаў у Мінск, зайшоў у "Маладосць" да Анатоля Грачанікава. "Васіль, вяртайся ў Гомель, – прапанаваў. – У мяне Афанасьеў – сябар лепшы. Едзь на "Гомсельмаш", дапаможа".

Прыехаў, пайшоў у шматтыражку "Сельмашавец" да Гулевіча. Той дае заданне напісаць артыкул пад назвай "Чаму адстае "Гомсельмаш?" Я – да Мацвея Барысавіча Шура. Працаваў тады на заводзе начальнікам вытворча-дыспетчарскага ўпраўлення такі легендарны чалавек.

– На працу ўладкоўваюся, – кажу.

– Сядай, пішы!

Усё запісаў, літаратурна апрацаваў. Гулевічу спадабалася. Так і трапіў на "Гомсельмаш".

* * *

– У "Сельмашаўцы" я тры гады прабыў. Неяк былы франтавы лётчык Аляксандр Зайчанка расказаў, як у час вайны яму давялося бамбіць Гомельскі чыгуначны вакзал. Да абеду я ўсё апрацаваў, аддаў матэрыял Гулевічу. Той запрасіў Зайчанку вычытаць.

– Ужо напісаў? А я ж вось гэтага не расказваў?

– Што, не так напісана?

– Не, так і было. Але ж адкуль ён ведае?

* * *

– Я хутка працаваў. Заданне выканаю – не ведаю, што рабіць. Так п'есы пачаў пісаць – "Сівы бусел", "Вокны", "Прыгоды з Канапухіным", "Кветкі-ягадкі". Потым кватэру атрымаў, у "Гомельскую праўду" запрасілі стылістам. Пайшоў, хутка стаў спецыяльным карэспандэнтам. А праз паўгода з Міністэрства культуры, куды я паслаў сваю п'есу "Сівы бусел", прыйшла прапанова паехаць на Усесаюзны з'езд драматургаў у Піцунду. Я прыйшоў да рэдактара Уладзіміра Лазько. "Ты хто, – пытаецца, – журналіст ці драматург? Калі драматург, то звальняйся і едзь". Я звольніўся і паехаў. Міністэрства тады, дарэчы, п'есу набыло за 3 тысячы рублёў – вялікія грошы па тым часе. І адразу ж рэкамендавала паставіць у Магілёўскім абласным тэатры. У тым жа годзе гамяльчане паставілі "Вокны". Кніга выйшла.

* * *

– Самае цікавае, што з п'ес я пачынаў яшчэ ў школьныя гады. У нас на вёсцы жыў адзін чалавек. Калі памерла жонка, ён пачаў выбіраць, з кім сысціся зноў. Ну, старыя людзі сядзяць, размаўляюць на гэту тэму, а я думаю: "Дайка напішу". І напісаў. Чытаў каля Мікіты, мужыкі слухалі, рагаталі. Гэта быў мой першы вопыт у драматургіі.

* * *

– Пасля "Гомельскай праўды" я гадоў пяць быў на вольным хлебе. Потым мяне прынялі ў Саюз пісьменнікаў, абралі старшынёй абласной пісьменніцкай арганізацыі. Месца не вельмі хлебнае, бо аклад маленькі, затое я – сам сабе гаспадар. Тады пісьменнікам жылося лепш. Паставіла выдавецтва кнігу ў план – абавязкова выдадуць, ганарар заплацяць. А цяпер паспрабуй у той план трапіць. Да таго ж, замест ганарара дадуць табе некалькі асобнікаў, прадавай іх, зарабляй сабе на жыццё.

* * *

– Падчас майго кіравання абласной пісьменніцкай арганізацыяй у яе склад уваходзілі такія літаратурныя волаты як Міхась Даніленка, Іван Сяркоў, Уладзімір Верамейчык, Мікола Янчанка, Ізяслаў Катляроў, Соф'я Шах, іншыя. І я, як толькі дазваляў час, спрыяў развіццю іх творчасці.

Ганаруся тым, што тады, у пачатку дзевяностых, калі дзяржаве было не да літаратараў і нас ніхто не падтрымліваў, Гомельская абласная пісьменніцкая арганізацыя здолела тройчы ажыццявіць выпуск літаратурнага альманаха "Магістраль", на старонках якога знайшлося месца для твораў практычна ўсіх пісьменнікаў і паэтаў рэгіёна. Гэта былі першыя ластаўкі такой працы нават у маштабах рэспублікі. А якія літаратурныя святы "Над Дняпром, Дзясной і Сожам" мы ладзілі разам са сваімі калегамі з Мінска, Кіева, Чарнігава і Бранска? Ездзілі ў Глінішчы на радзіму народнага пісьменніка Івана Мележа, у Жураўічы – да Андрэя Макаёнка, на Буда-Кашалёўшчыну – да Міхася Лынькова. Актыўна ўдзельнічалі ў святе гумару ў Аўцюках.

### З НАБАЛЕЛАГА

– Люблю людзей, бо яны – героі маіх твораў, побач з якімі адчуваю сябе, як рыба ў вадзе. Стараюся заўсёды прытрымлівацца сваіх поглядаў, магу пажартаваць, але дасціпна, магу сказаць нешта крытычнае, але сказаць так, каб чалавек не крыўдзіўся, каб успрымаў гэту крытыку, як добрую параду. Ніколі і нікому першым не рабіў гадасцей.

Але калі гадасці рабіліся ў дачыненні да мяне – стараюся адказваць, даць здачы. Лічу – гэта па-мужчынску. .

* * *

– Народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін неяк на вечарыне ў Саюзе пісьменнікаў адзначыў, што Гомель будзе яшчэ ганарыцца тым, што тут жыў і працаваў Васіль Ткачоў. Ці адчуваю я гэта? А хіба не? Мною, маёй творчасцю ганарыліся і ганарацца мае сябры, мая жонка, мае дзеці, мае бацькі, калі былі яшчэ жывыя. Ганарыцца "Гомсельмаш", дзе я некалі працаваў, дзе завёў добрых сяброў, ад якога атрымаў кватэру і ў рабочым пасёлку якога жыву. Ганарацца шматлікія прататыпы маіх герояў. А што яшчэ трэба пісьменніку і творцу?

* * *

– На творчых сустрэчах цікавыя выпадкі адбываюцца. Неяк з дзецьмі сустракаўся. Паказваю кніжку "Карасі на пяску". На вокладцы там намаляваны міліцыянер, абкручаны дротам. Пытаюся: "Дзеці, што гэта такое?" Гадаюць. Адзін хлопчык кажа: "Самагонны апарат". Дзяўчынка не згаджаецца: "Не, у нас дома не такі".

Увесь клас рагатаў.

* * *

– Неяк у Буда-Кашалёўскім раёне сутрэча была. Выступілі, сядзім у настаўніцкай. Заходзіць настаўніца:

– Ну, Кавалёў! Ну, Кавалёў!

– Што Кавалёў? – гэта дырэктар голас падае.

– Ды двойку яму стаўлю, а ён кажа: "Стану трактарыстам – сена не прывязу". Паставіла тройку. Бо стане трактарыстам – бегай тады за ім.

Праз некалькі год я зноў быў там. Сустракаю настаўніцу, пытаюся, ці стаў Кавалёў трактарыстам. "Стаў,– кажа, – на "Беларусу" ездзіць, "прывітанне" крычыць. І сена возіць. А паставіла б двойку – не вазіў бы".

* * *

– Апошнім часам "налягаю" больш на драматургію. Мне пашанцавала прымаць удзел ва Ўсесаюзных нарадах драматургаў у Піцундзе (Абхазія), Дубулты (Прыбалтыка), Рузе (Падмаскоўе). Там пазнаёміўся і пасябраваў з Міхаілам Варфаламеевым, Валянцінам Азернікавым. Валянцін Азернікаў нават пераклаў на рускую мову маю п'есу "Сівы бусел". Але ж і прозу не закінуў. Я – з пароды шматстаночнікаў. Калі не ідзе п'еса, забуксаваў творчы працэс – на прозу пераключаюся, дзіцячае апавяданне напішу, гумарэску. Настрой тады і зменіцца. А разам з настроем прыходзіць натхненне.

Запісаў Мікола ДЗЯМЧЫХІН.